BIBLIOTEKARZ PODLASKI
2018/2 (XXXIX)
ISSN 1640-7806 (druk)
ISSN 2544-8900 (online)
http://bibliotekarzpodlaski.ksiaznicapodlaska.pl/



Hanna Barvenava*
Narodowa Akademia Nauk Białorusi
Mińsk

# The Renaissance Costume in the Illustrations Included in the Bible Published by Francysk Skaryna

**Summary:**

The article focuses on the Renaissance costume, which is depicted in the illustrations of the Bible published by Francysk Skaryna. The illustrations perfectly reflect the culture, fashion, and mores prevalent in the Grand Duchy of Lithuania in the 15th and 16th century. The author examines types of clothes, their fabric (wool, silk, golden silk, linen, paper, leather, plain weave), their colours (scarlet, azure, blue, red, light blue, brown, gold, silver), their adornments (precious stones, embroidered with gold, silver as well as with wool and linen thread), etc. Concluding, he asserts that the ideal of beauty was based on the principle of rationality and naturalness, which was clearly manifested in the fashion prevalent at the time.

Moreover, the article focuses on the lexis of Skaryna's old Belarussian. While referring to the textile industry, weaving machines, colours of fabric, adornments, regalia, he enumerates a long list of names of old clothes and parts of clothes. In the 15th and 16th century, Belarussians created their own images of Gothic and, later, Renaissance costumes, which now enrich our understanding of the Renaissance costume in Europe.

* Hanna Barvenava – prof., kierowniczka Działu Sztuk Plastycznych i Dekoracyjnych Białoruskiego Centrum Kulturoznawstwa, Języka i Literatury Narodowej Akademii Nauk Białorusi w Mińsku.

**Key words:** Renaissance costume, the culture of the Grand Duchy of Lithuania, Belarussian traditions

**Renesansowy kostium na rycinach Biblii autorstwa Franciszka Skaryny**

**Streszczenie:**

Artykuł skupia się na temacie kostiumu z epoki Odrodzenia, występującym w wydanej przez Franciszka Skarynę Biblii. Dzieło to wzorcowo odzwierciedla kulturę, modę i zwyczaje Wielkiego Księstwa Litewskiego z wieków XV i XVI. Badacz analizuje m.in. to, jakie się w nim pojawiają rodzaje ubrań, z jakich materiałów były zrobione (wełna, jedwab, złocony jedwab, len, papier, skóra, płótna), jakiego były koloru (szkarłatny, lazurowy, niebieski, czerwony, siny, brunatny, złoty, srebrny), czym były zdobione (kamienie półszlachetne, haftowane złotem, srebrem oraz wełnianą lub lnianą nicią) etc. Poczynione obserwacje pozwalają wnioskować, że ideał piękna opierano wówczas na zasadzie racjonalności i naturalności, co odbijało się również w modzie.

W artykule przeanalizowano ponadto starobiałoruską leksykę języka Skaryny. Opisując szczegółowo włókiennictwo, narzędzia do tkactwa, kolory tkanin, ozdoby, symbole władzy, wymienia on dużą liczbę dawnych nazw odzieży i jej składowych części. W wiekach XV i XVI Białorusini stworzyli własne wizerunki gotyckiego, a później i renesansowego kostiumu, które wzbogacają niezwykle złożony obraz ogólnie pojmowanego renesansowego stroju w całej Europie.

**Słowa-klucze:** strój renesansowy, kultura Wielkiego Księstwa Litewskiego, tradycje białoruskie

Кожны беларус ведае словы Францыска Скарыны, сказаныя ў яго прадмове да Біблії: *Понеже от прирожения звери, ходящия в пустыни, знають ямы своя, птици, летающие по возъдуху, ведають гнезда своя; рибы, плывающие по морю и в реках, чують виры своя; пчелы и тым подобная боронять ульев своих, – тако ж и люди, и где*

*зродилися и ускормлены суть по бозе, к тому месту великую ласку имають*[1], якія сталі сімвалам любві і адданасці Радзіме. У 500 годзе з часоў выдання Бібліі Францыскам Скарынам зноў асэнсавана багацце, якое нам падараваў вялікі мысляр Рэнесансу. Веды, якія ён нёс суайчыннікам у перакладах, адкрывалі шырокую дарогу да таямніц жыцця, да мудрасці, якая акумуляваная ў святых кнігах. Партрэт Францыска Скарыны, надрукаваны ў Бібліі, – выразны паказчык усведамлення аўтарам уласнай ролі ў гісторы.



Францыск Скарына. 1517. Гравюра.

1 КЮ. Скарына. Кніга *Юдзіф*, 2б.

Біблія Скарыны – унікальны дакумент эпохі Рэнесансу[2]. Выданні Францыска Скарыны, найперш мова і гравюры, паказваюць велізарны культурны пласт, які мелі і павінны былі засвоіць жыхары Вялікага Княства Літоўскага[3].

Тэкст і гравюры выдадзеных Францыскам Скарынам кніг паўплывалі на далейшае развіццё беларускага грамадства. Тэкст Бібліі, гравюры тлумачылі і праслаўлялі вечныя ісціны, даводзілі ролю святара, караля і каралевы, мужчыны і жанчыны ў грамадстве, выпрацоўвалі павагу да эліты грамадства і г.д. Адначасова выданні Скарыны праз слова і выяву дэманстравалі сакральнасць, каштоўнасць і прыгажосць архітэктуры, прадметаў матэрыяльнай культуры, інсігній ўлады, строяў. Тэкст і гравюры Бібліі перадаюць геапалітычны і сацыяльна-палітычны кантэкст часоў Вялікага Княства Літоўскага, імкненне Царквы, эліты Княства прапагандаваць агульнаеўрапейскія каштоўнасці, уплываць на развіццё мовы, культуры беларусаў.

Францыск Скарына падараваў нам скарбонку сведчанняў матэрыяльнай культуры Беларусі канца XV пачатку XVI стагоддзяў. У гэтым артыкуле звернем увагу толькі на тэкстыль і касцюм жыхароў Вялікага Княства Літоўскага, пададзеных на старонках выданняў Францыска Скарыны.

Мова выданняў Скарыны прапаноўвае смакаваць старажытнабеларускія словы як *одеяние, водежа, одеаныи, одеватися*, *одетися*, *воскрилия, падпаясацица, обувъ*[4] і г.д. Сотні словаў-тэрмінаў дэманструюць багацце гатункаў тэкстылю (*шелк, волна, льняны, волняныи, бумажныи*), інструментаў для вырабу тэкстылю (*веретено*) і аздобы (*взоровато, вышивание*), колеры тканін (*барва, брунатныи*), тлумачаць назвы адзення і яго кампанентаў (*риза, плащ, власеница, локтушие, опона, платье постелное)*, якасць адзення (*ризы ветхи содраны,*

2 *Біблія: Факс. ўзнаўленне Бібліі, выд. Францыскам Скарынаю ў 1517–1519 гг.*

3 *Францыск Скарына і яго час.* Энцыклапедычны даведнік. Менск, 1988; *Францыск Скарына. Зборнік дакументаў і матэрыялаў*, уклад. В. Дарашкевіч, Я. Неміроўскі. Менск, 1988.

4 *Слоўнік мовы Скарыны*. Т. 1, 427, 450, 419.

*моль казить ризу*) і іншае. Названы сімвалы ўлады – *коруна*, *венец*, *жезл* – і дадзена ім характарыстыка: *венець надежі*, *добродетелеі*, *похвалы*; упрыгожванні (*обручи*, *перстени*, *гривны*, *защепки*, *серязи и иные приправы златые)*. Гравюры выданняў Францыска Скарыны, адначасова з мовай, выразна паказваюць тыповы строй эліты ўсходнееўрапейскага грамадства эпохі Рэнесанс. Паспрабуем адказаць на некаторыя пытанні па гісторыі тэкстылю і касцюму пачатку XVI ст.

**Якія тканіны выкарыстоўваліся на адзенне?** Шматразова ў перакладах называюцца воўна, шоўк, шоўк са златам, лён, бумага: *Волна изъ волны овець моихъ*[5] (КІ 37); *Агнеци потребни суть на одежу тобѣ*[6] (ПС 42); *лЬнъ вже пупенце выпущалъ*[7] (КВ 19б); *мужевъ обълеченныхъ въ ризы жреческие льняные*[8] (ПЦ 48); *Риза сукняна или плотняна она… имела блескъ прокажения на основе или на утку*[9] *(*КЛ 26б*); не облечешися въ ризу ту еже зъ волны со льномъ соткана есть*[10] (ДЗ 43); *ризу бумажную и клобукъ з бумаги уделаешъ*[11] (КВ 54б) і інш.

Кожная жанчына павінна клапаціцца пра сям'ю, дбаць, каб усе ў сям'і былі апрануты: *Вси бо домашнии ея облечены суть во двѣ ризе*[12] (Пс 47б). Адпаведна, кожная жанчына павінна ўмець трымаць верацяно і рабіць нітку, умець ткаць і шыць: «*и персты ея похватиша веретено*» (ПС 47-47б); «*напрясти вси жены умелыи еже были напряли*» (КВ 67). Словы «*нить*», «*напрясти*», «*соткала*», «*основа*», «*уток*», «*взорами промежи основы*», «*остен*» – іголка (452) шматразова названы ў Бібліі. Беларускі спрадвеку выраблялі ніткі з воўны, ільну, каноплі, што пацвярджаюць археалагічныя даследаванні [Барвенава, Дучыц]. З нітак ткалі тонкія і тоўстыя рознага перапляцення тканіны: *платно толъстое* (ІС 65); *Поискала естъ волны и ильну, и делала естъ совѣтомъ рукъ*

5 КІ. Скарына. Кніга *Іова*, 37
6 ПС. Скарына. *Прытчы Саламонавы*, 42
7 КВ. Скарына. Кніга *Выхад*, 19б
8 ПЦ. Скарына. Першая кніга *Царстваў*, 48
9 КЛ. Скарына. Кніга *Лявіт*, 26б
10 ДЗ. Скарына. *Другі закон*, 43
11 КВ. Скарына. Кніга *Выхад*, 54б
12 Пс Скарына. *Псалтыр*, 47б

*своихъ* (ПС 47); *да вчиниши десеть опонъ зъ белого лну пресукрваного* (КВ 48); *связывалъ снуръ шолку синего* (КВ 73б). Шыць умелі, таму і слоў звязаных з пашывам адзення нямала: *мати делывала ему одежу малу* (ПЦ 8б), *врътище пошилъ есмъ* (КІ 22); *розрезалъ платие* (ДЦ 82б).

Акрамя тканін мясцовага вырабу ў ВКЛ былі запатрабаваны тканіны імпартаваныя. Шаўковыя тканіны імпартавалі ў Вялікае Княства з часоў сярэднявечча, адпаведна былі вядомы іх назвы: «*паволока и оксамитъ*», «*оксамитъ со златомъ*» і інш. Купцы прывозілі і актыўна прадавалі кашоўны тэкстыль і шматлікія тавары для адзення, а калі ёсць грошы, то цяжка што-небудзь не набыць, бо *Всякии купець егда купуеть говорить лихо есть* (ПС 31б). Шматразова называюцца ў перакладах меры даўжыні і як мералі тканіну: *Локоть вдолжъ имети будеть, а вширь локоть и полъ* (КВ 49).

**Якія былі асноўныя колеры тканін і адзення?** Якія былі «*барвы*», «*фарба*», «*краскі*»? У выданнях Францыска Скарыны названы *багровыи, лазуровыи, небесное, голубое, красныи, синии, бурнатныи, червчетыи* і іншыя барвы. Да прыкладу, *шолку синего и черъвчетаго двакрать крашенаго и злата тягненаго (КВ 68)*; *Лазуровыи повешены были со всихъ странъ опоны и ковры небесное, фарбы тоесть голубое со златомъ промешиваное и лазуровое зъ иншыми фарбами* (КЭ 3б). Фарбавалі тканіну і скуры: *Шерсть козью и кожи барание красныи и синии* (КВ 45). Ніткі, тканіны, скуру фарбавалі мясцовымі і імпартаванымі фарбавальнікамі, напрыклад, «*інъдиискымъ краскамъ*» (КІ 33б). Найбольш сімвалічнай і запатрабаванай у касцюме была тканіна, афарбаваная ў чырвоны колер ці адценні чырвонага колеру. Чырвоны колер прысутнічаў пачынаючы з нараджэння дзіцяці. Так чырвоная нітка завязвалася на руку немаўля, маленькага дзіцяці як абярэг: *Егда же рожахуся детища единъ изведе руку, на нея же баба* (павитуха) *навеза нить червчату* (КБ 71). У беларускай культуры такі звычай завязвання ніткі на ручку немаўляці захоўваўся да сярэдзіны XX ст. і лічыцца традыцыйным [Валодзіна]. Чырвоны колер, залатыя ніці прысутнічалі ў адзенні караля, каралевы, святара: *нарядися въ ризы красныи* (КЮ 16); *плащемъ багровымъ* (ЛК 12б); *Узрелъ есми межи иными речами користи плащъ брунатныи велми добрыи* (ІН 16); *плащь шолковыи тканыи со златомъ* (КЭ 14б).

Адзенне эліты грамадства выконвалі пераважна з каштоўных тканін, багата аздаблялі залатымі і сярэбранымі ніткамі, каштоўнымі і напаўкаштоўнымі камянямі: *облеченыи въ ризы Царскии ильснущиеся златомъ и камениемъ драгимъ* (КЭ 23); *уделана отъ шелку и злата тягненаго и смагардовъ со инымъ камениемъ драгимъ* (КЮ 17б); *блищашеся ризою царскою* (КЭ 14б) і інш.

Адзенне вышывалі шаўковымі, залатымі, сярэбранымі, ваўнянымі, льнянымі ніткамі: *Вышивание злата сребра шолку и льну ко вышивании взоровъ всего злата* (КВ 72-72б); *съ злата тягненого съ шолку синего…деломъ вышиванымъ* (КВ 49б). Такую складаную працу выконвалі майстры аздобы тканіны і адзення: *Вышивач мастеровъ и вышивачевъ* (ЧЦ 238); *Вышивачевъ сын* (ДЦ 110); *делали дела дойлидска гафтарска и вышивана отъ злата* (КВ 67б).

Трэба сказаць, што мова выданняў Францыска Скарыны дапамагае высветліць многія тэрміны XV–XVI стст., звязаныя з вырабам тэкстылю, з кравецтвам, шавецтвам. Напрыклад, і сёння паэтычна гучыць шматразова паўторанае ў перакладах слова «*воскрилие*» (крысо): *воскрилия плаща твоего*, *жена ухапила за воскрилие ризы* (КБ 72); «*пола*» адзення: *ягодъ полну полу ризъ своихъ* (ЧЦ 192б); «*падолак*» (падол адзення): *подолку плаща его* (ПЦ 32); «*зхожатися*» (злучацца): *Два подолки споено имети будеть при конъцехъ обоего боку, дабы воедино ся зхожали* (КВ 52б); «*зысподу*» ці «*сысподу*» (прыпол): *Вделаешъ къ тому и два кружки златыхъ, еже пришиешъ сысподу зовнутрь на полици* (КВ 53б) і інш.

**Якія асноўныя рысы касцюма эпохі Рэнесанс?** Творы мастацтва, на якіх адлюстраванае ўбранне эпохі Рэнесанс ва Ўсходняй Еўропе, агульнавядомыя, таму мы звернемся не толькі да апісання ўбору, да тэрмінаў, а і да перадумоў узнікнення строяў, да ідэала прыгажосці, распаўсюджанага ў тую эпоху.

Эпоха Ренесанс раскрыла значэнне чалавека як адметнай Асобы. Новае светаадчуванне, у якім цэнтрам становіцца «Я» чалавека, пачынае выяўляцца ва ўсіх сферах жыцця. На гравюрах выданняў Францыска Скарыны кожны твар, постаць індывідуальныя. Перад чалавекам эпохі Рэнесанс узнікла неабходнасць ва ўдасканаленні розуму, фізічнай моцы, у выпрацоўцы трывалага характару. Пры

гэтым даводзілася таксама дбаць пра прывабны знешні выгляд, пра элегантнасць і вытанчанасць паводзінаў. *Была то есть Есферъ вельми красна, и для превеликое красы была всемъ лба и вдячна* (КЭ 6б). Ідэі Рэнесансу, новы мастацкі стыль, у аснове якога быў рацыянальна-канструктыўны пачатак, натуральна паўплываў і на ўбор. Ідэал прыгажосці эпохі Рэнесансу будаваўся на прынцыпе мэтазгоднасці і натуральнасці, што адлюстравана ў модзе.

Як жанчына, так і мужчына імкнуліся ўсяляк прадэманстраваць сваю прыгажосць. Пры гэтым мужчынская прыгажосць выяўлялася галоўным чынам у мужнасці, а жаночая – у мацярынстве. Мужчына здзяйсняў рыцарскія подзвігі, не баяўся ніякіх перашкод, набываў веды, адкрываў новыя краіны і гандлёвыя шляхі. Жанчына была штохвілінным увасабленнем жаноцкасці, святла, дабрыні, кахання. Але чалавека не задавальнялі толькі такія ўскосныя доказы прыгажосці і мужнасці, таму ўбор дапамагаў прадэманстраваць тое, чаму эпоха надавала галоўнае значэнне. Так, у мужчынскім уборы ўсяляк дэманстравалі моц і прыгажосць мужчыны падкрэсліваннем шырыні плячэй, вылучэннем мускулаў і г. д., а жаночы ўбор дапамагаў падкрэсліваць грудзі, стан і сцёгны. Кожны чалавек імкнуўся пераканаць усіх у прыгажосці ўласных формаў, у тым, што менавіта ён з'яўляецца жывым увасабленнем пануючага ідэала прыгажосці.

Біблія Скарыны гэта своеасаблівае пасланне пакланення Мадонне, жанчыне, маці, каханню. Каралева, вялікая княгіня з'яўляліся для еўрапейскага грамадства ідэалам прыгажосці, адпаведна іх прывабнасць была прадэманстравана людзям праз глыбокае дэкальтэ жаночай сукенкі, стромкі стан, пышную спадніцу, густыя валасы, багатыя тканіны і ўпрыгожванні. Побач з далікатнай, прывабнай і прыгожай напаўаголенай жанчынай на гравюрах Бібліі выступае мужны, мажны, дзейны, па-еўрапейску апрануты мужчына.

Мода эпохі Рэнесанс, калі і жанчына, і мужчына дэманстратыўна паказвалі тое, чаму іх век надаваў найбольшую каштоўнасць, яскрава адпавядала пачуццёваму характару эпохі. Ніхто не лічыў дзіўным, што мужчына і жанчына такім даволі не далікатным чынам уздзейнічалі на пачуцці адзін аднаго. Зразумела, што пачуцці мужчыны і жанчыны заставаліся далёка не абыякавымі да падобных

узбуджальнікаў, а, наадварот, прыводзіліся імі ў стан пастаяннага трымцення. Гісторыя і літаратура эпохі Рэнесансу багатая доказамі таго, як пачуцці мужчыны і жанчыны ўспыхвалі чароўным полымем захаплення, закаханасці і кахання.



Гравюра “Эсфір царыца і цар Ясвер” з кнігі “Эсфір”.

Прыгожыя людзі маюць прыгожыя пачуцці. Францыск Скарына, які шмат што перажыў і ўбачыў за жыццё, перадаваў жыццёвую праўду ў сваіх перакладах. Каханне – дар Бога, бо “*Богъ занепразнилъ коханиемъ сердце его*” (КЕ 9б). Аднак Бог прапануе, пры магчымасці, кантраляваць свае пачуцці: “*Можетъ человѣкъ сокрыти огонь въ лоне своемъ, абы ризы его не загорѣлися*” (ПС 13); “*Яко моль казить ризу и червъ древо, тако и тоска мужа вредить сердце*” (ПС 39). Эпоха Рэнесансу жыццём даказвала, што каханне – вышэй за карону. Выразным агульначалавечым прыкладам першынства кахання, стала каханне караля Жыгімонта Аўгуста і Барбары Радзівіл, змаганне за каханне і, зрэшты, смерць.

Рэнесанс быў творчай эпохай, векам здаровай і моцнай пачуццёвасці. Паколькі гаворка вядзецца пра моду пануючага класа, дык яна не ведала крывадушнай сарамлівасці, страха, а смела і бязбоязна даводзіла, што чалавек – стварэнне Бога, кожны чалавек прыгожы, каханне – пацалунак Бога. Самыя прыгожыя, эталоны прыгажосці гэта кароль і каралева, князь і княгіня. «Я створаны для любві», – казаў мужчына жанчыне пры дапамозе свайго ўбрання. «Я дастойная твайго кахання», – адказвала яна яму яшчэ больш выразна пры дапамозе свайго ўбору. Можна сказаць, што мода ў эпоху Рэнесанс была эратычнай. Канструкцыя і дэкаратыўная аздоба адзення палягала ў падкрэсліванні прыгажосці цела, у эратычнаым уздзеянні. Гэтая мэта асабліва відавочная на прыкладзе жаночай моды, якая ў адпаведнасці з ідэямі Рэнесансу рэпрэзентуе прыгажосць грудзі, шыі, валасоў, постаці жанчыны. Відавочнае падкрэсліванне ўсяго пачуццёвага і штохвіліннае дэманстрацыя індывідуальнай фізічнай прыгажосці павінна была стаць і стала галоўнай тэндэнцыяй моды Рэнесансу. Менавіта ў гэтым – асноўная рыса, якая вызначае большасць касцюмаў эпохі Рэнесансу ва ўсіх краінах Еўропы, у тым ліку ў Вялікім Княстве Літоўскім.

Другой адметнасцю касцюмаў была раскоша. Эпоха Рэнесансу – век сусветнага гандлю, адкрыццяў – стварала бязмежнае поле для магчымасцяў набыцця бязмежнага багацця і яго дэманстрацыі. *Кроме иныхъ окрасъ и запонъ и ризъ со златомъ ими же цари… украшахуся (КС 20); неся венець златыи на главе своеи одъаныи во плащь шолковыи тканыи со златомъ* (КЭ 14б); *Князи же принесша камение онихиново, и жемчугъ на плащъ жреческии* (КВ 67). Багацце, раскоша заўсёды ў першую чаргу выяўляецца ва ўбранні, бо гэта самы відавочны і хуткі спосаб прадэманстраваць багацце: *жена… преукрашенную ризу уделала естъ собъ, паволока и оксамитъ одежа ея* (ПС 47б). У гэтую эпоху мужчыны і жанчыны носяць масіўныя залатыя ланцужкі і іншыя ўпрыгожванні, на адзенне выкарыстоўваецца велізарная колькасць тканіны, вышыўкі, каштоўных камянёў, якія ілюструюць багацце ўладальніка і яго дзяржавы.

**Які касцюм насілі жанчыны Вялікага Княства Літоўскага ў часы Рэнесансу?** Галоўны кампанент жаночага строю – сукенка, сукня: *сво-*

*локла есми исъ себе сукню свою (ПП 7)*. Прыгажосць жанчыны, як было сказана вышэй, дэманстравалі смелым агаленнем грудзей. Рэнесанс прытрымліваўся погляду, што *крепость и красота одежа ея (ПС 476)*, а аголеная жанчына заўсёды прыгажэй за апранутую. Жанчыны паказвалі тое, што лічылася найвялікшай прыгажосцю жанчыны і ўсяляк падкрэслівалася пры дапамозе моды – грудзі. Падкрэсліванне грудзей і стану было часткай агульна еўрапейскага культу жаночай прыгажосці. Такім чынам, усе жанчыны ў большай ці меншай ступені дэкальтавалі свае грудзі. Нават немаладыя ўжо кабеты імкнуліся як мага больш часу ствараць ілюзію наяўнасці ў сябе поўных і пышных грудзей.

Эпоха Рэнесансу яскрава ілюструе, што вызначае моду не клімат, а грамадскае быццё і прыняты ў ім ідэал прыгажосці. Клімат заўсёды стварае толькі колькасныя, а не якасныя адрозненні. На Паўночным Усходзе Еўропы існаваў такі самы ідэал прыгажосці, што і на Поўначы. Жыхаркі Вялікага Княства Літоўскага агалялі свае грудзі не меней за венецыянак ці рымлянак. Мяжу тут праводзіў толькі класавы падзел. Пануючыя класы, дзе галоўнай раскошаю лічылася менавіта жанчына, даводзілі дэкальтэ да крайняй ступені. Таму на гравюрах Францыска Скарыны каралева на троне каралю і ўсяму свету паказвае сваю прыгажосць і прывабнасць.



Фрагмент гравюры “Царыца Саўская з царом Саламонам” з кнігі “Еклісіаст”.

Выраз дэкальтэ быў настолькі глыбокім, што грудзі і спіну пакідалі амаль аголенымі. Карсет у эпоху Рэнесансу прызначаны быў не для таго, каб схаваць грудзі, як каб штучна ўзняць іх ўверх. Каб болей звярнуць увагу на прыгажосць грудзей, дэкальтэ сукенкі аздаблялі аблямоўкай з каштоўнай тканіны, каштоўнымі камянямі, перламі. Аздоба, аблямоўка дэкальтэ, каўняра называлася «оклад»: *Вделалъ теже ризу подъ плащь… и колнеръ при стране верхнеи противу средины, и оклады около ея соткaны* (КВ 73б). Жанчыны аздаблялі дэкальтэ пацеркамі, залатымі ланцужкамі, «*ожерелье*», «*манисто*»: *ожерелье сукни обыяше мя* (КІ 36); *Вложи шию твою въ манисто* (ІС 13). Аналагічная мода на падкрэсліванне грудзей панавала па ўсёй Еўропе.

Паверх сукенкі накідваўся плашч, які зашпільвалі на «*запоны*»: *Красны суть ягоды лица твоего яко горлички, шия твоя яко запона* (ПП 3б); *кроме иныхъ окрасъ и запонъ и ризъ со златомъ* (КС 20); *давалъ запоны златыи на окрашение ваше* (ДЦ 67б). Абутак аздаблялі вышыўкай: *обулася въ боты украшеные* (КЮ 16); *Ботки ногъ ея вышиваные златомъ* (КЮ 25).

Галаву ўпрыгожвалі кароны, дыядэмы, вянкі з розных кветак: *Наделаемы собе рожаныхъ венцевъ прежде нежели увянуть* (ПБ 4). Завяршалі жаночы вобраз «*серязи*»: *прото жъ завесихъ серязи во уши еи на окрасу лица ея (КБ 43б); Серга златая и жемчугъ ясныи (ПС 38б); вынялъ естъ мужъ серязи златыи еже важили два сикли, и два обручи еже важили десять сиклевъ (КБ 42).* Рукі аздаблялі бранзалеты, якія называліся *«обруч»: увиделъ серязи и обручъ на рукахъ въ сестры своея (КБ 42б); Іудифъ… возложи обручь златыи на правую руку свою (КЮ 16).*

Гараджанкі ВКЛ засвоілі прыняты ідэал прыгажосці, таму іх убор быў пабудаваны на тых жа прынцыпах падкрэслівання грудзей і стану. У асяродку незаможнай шляхты і гараджан жанчыны насілі сукенку з не такім шчодрым дэкальтэ, як жанчыны пры каралеўскім і княжацкім дварах. Доказы існавання такой моды можна ўбачыць на гравюрах Францыска Скарыны. Глыбіня дэкальтэ сукенкі каралевы і сукенкі жанчын яе світы адрозніваюцца на карысць прыгажосці каралевы. *Царица поняла съ собою две панны, и на едину спомянула якобы для великое роскоши и дрочения* (фанабэрыстасць, ганарыстасць) *не могла теломъ своимъ одужити* (КЭ 23). Даўжыня



Фрагмент гравюры “Дачка фараона знайшла Маісея ў вадзе” з кнігі “Выхад”.

сукенкі, шлейф ў каралевы таксама былі даўжэйшымі: *была естъ на неи одежа долгая даже до глъзнъ* (ДЦ 89); *Другая же панна шла за нею несучи плащъ ея, онъ же по земли влачашеся* (КЭ 23). Адзенне гараджан капіравала адзенне шляхты, толькі было выканана з менш каштоўных матэрыялаў. Магчымасці набываць дарагія тканіны ў гараджан было менш, таму яны мелі строі падобныя да шляхецкіх, толькі ў больш танным выкананні.

**Мужчынскі касцюм** складаўся з шматлікіх кампанентаў: *одеваху его ризами многими* (ТЦ 120); *в срачицахъ и въ шапкахъ и въ обувяхъ и въ ризахъ (ДП 116); явися ему мужъ во лняныхъ ризахъ (ДП 29); делати будете полицу на перси плащъ ризу лняну узку клобукъ и поясъ (КВ 52)*; *сапогы и набедрне и наплечникъ возложилъ естъ на него* (ІС 72); клобукъ *теже возложилъ на главу его* (КЛ 16б-17) і г.д.

У мужчынскім убранні вырашалася тая ж задача падкрэслівання прыгажосці чалавека: *умыися ты и намажся и облечися въ лепшии*

*ризы* (КР 5б). Мужчына апранаўся ў адзенне, якое абціскала цела, выразна падкрэслівла кожны мускул ног, вузкую талію, шырокія плечы: *ризы еже делати будете по лицу ... Ризу лняну узку* (КВ 52). Вузкім адзеннем мужчыны падкрэслівалі талію, моц сцёгнаў: *Споение бедрь твоихъ яко запоны еже оуделаны суть рукою маистера* (ПП 9). Паколькі сама куртка рабілася як мага вузейшай, яна ператваралася амаль у другую скуру чалавека. Вузкімі былі і мужчынскія порткі. Такая мода набыла росквіт у эпоху готыкі, уладарыла амаль усё XV ст., захавалася ў пачатку XVI ст. Паколькі ў сваіх крайніх праявах падобная модная тэндэнцыя прыводзіла да амаль поўнай бездапаможнасці ў рухах, паступова адбыўся пераварот, які прывёў да наступнага вырашэння праблемы: каб даць магчымасць рухацца больш свабодна і лёгка, порткі і рукавы курткі ў некаторых месцах былі прарэзаныя. Такія разрэзы дэкаратыўна аздаблялі: скрозь іх праглядала шаўковая кашуля ў выглядзе буфаў, а да разрэзаў у нагавіцах дадавалі буфы іншых колераў. Так, прыблізна ў канцы XV стагоддзя ўзнікла мода на разрэзы і буфы, на дэманстрацыю некалькіх слаёў адзення, дэманстрацыю ніжняй кашулі. Такая мода адкрывала



Фрагмент гравюры “Будаўніцтва храма ў Іерусаліме” з 3-й кнігі “Царствы”.

бязмежныя магчымасці дэманстратыўнаму выхваленню ўласным багаццем праз раскошу ўбрання, што, зрэшты, у часы Рэнесансу мела вырашальнае значэнне.

У сувязі з тым, што адзенне было вузкім, яго зашпільвалі на мноства пяцелек і гузікаў. Гузікі станавіліся не толькі функцыянальным



Фрагмент гравюры “Дачка фараона знайшла Маісея ў вадзе” з кнігі “Выхад”.

кампанентам адзення, але і яго ўпрыгожваннем: *Запинатися пятьдесятъ пуговокъ медяныхъ, съ ними же да запинаются петелки* (КВ 48б); *по петдесяти слилъ (мужъ) пугъвиць златыхъ они же вхожли до петелекъ опоновыхъ* (КВ 68б).

Для падкрэслівання таліі абавязкова апаясвалі адзенне поясам: *отрочищъ препоясанъ въ ризахъ лняныхъ (ПЦ 8-8б)*. Паясы былі скураныя: *Поясъ кожаныи на бъдрахъ его (ЧЦ 184б);* льняныя: *поясомъ илнянымъ да ся опояшеть (КЛ 31б)*. Пояс служыў для мацавання на ім мяча, нажа[13]: *Вси держаще оружия и научении на брань, единаго каждого мечь на бедрахъ его страху для нащного (ПП5б); Мечь извлъчень сыи, и выцягненъ изъ ноженъ своихъ (КІ 33б); Воевода...*

[13] Бохан, Ю.М. *Узбраенне войска ВКЛ другой паловы XIV – канца XVI ст.* Мінск 2002.

*имелъ повешеную деку въ ножнахъ у лядвеи (ДЦ 107)*. На пояс вешалі кашалі (*сумкы*, *мошница*, *калита*): *Сумкы грошеи взялъ (мужъ) съ собою* (ПС 14). На ногі абувалі чаравікі, боты *(бот*, *боток*, *чеботы)*, якія маглі быць упрыгожаны вышыўкай: *боткі ногъ ея вышиваные златомъ иняли суть очи его* (КЮ 25).

Важным кампанентам мужчынскага строю быў плашч, які быў альбо кароткім альбо вельмі доўгім, да зямлі. Кароткая апратка была



Фрагмент гравюры “Будаўніцтва храма ў Ерусаліме” з 3-й кнігі “Царствы”.

даўжынёй троху ніжэй за талію, але не на шмат. Плашч накідвалі на абодва пляча ці перакідвалі праз адно: *плащъ на оба рамена своя* (КБ 21); *мужъ старыи естъ одеаныи плащемъ* (ПЦ 59б). Плашчы, апратку шылі з розных тканін, зімовыя плашчы падшывалі футрам: *Горностаи Кроликъ Тхоръ Норка (КЛ 22б)*. Плашч быў абавязковым кампанентам адзення для падарожжаў, вайны: *людие… простерши плащъ на земли наметали суть на нь серязеи иже побрали были на битве* (КС 20).

Адзенне, апратка, плашч маглі мець каўнер: *въ нея же (въ ризе) середине наверху будеть колнеръ* (КВ 54); *Вделалъ теже ризу подъ плащъ… и колнеръ при стране верхнии* (КВ 73б). Зашпільвалі плашчы на шмат варыянтныя засцежкі -- «*запоны*», «*гаплики*», «*гафтки*» -- якія выконваліся з металу, упрыгожваліся каштоўнымі і напаўкаштоўнымі камянямі: *Гаплики…по краехъ плаща выникали* (КВ 73б); *Гафтки златые делаемъ тобъ прораживаные съ сребра (ПП 3б-4); Гаплик два розетезьки…воскладати будешъ на гаплики; наделаешъ и Гапликовъ златыхъ* (КВ 53).

Мужчыны аздаблялі шыю, рукі можа нават больш чым жанчыны: *мужи и жены дали суть Колнери и серязи, Перстни и Обручи (КБ 67); Облече и въ ризы красны, и гривну злату возложи на шию его (КБ 75б); Руце его гладкии златыи, полны яцинктовъ (ПП 8); обручек наделалъ к тому ризъ тканыхъ со лну. Ааронави и сыномъ его. И клобуковъ со обручками ихъ зъ бумаги (КВ 74).* Персцень быў не толькі ўпрыгожваннем, але і выконваў ролю пячаткі: *царь запечаталъ естъ перстнемъ своимъ и печатьми вельможъ своихъ (ДП 22); пишите… и запечатаите е перстенемъ моимъ (КЭ 14).*

І мужчынскае і жаночае адзенне шылі з даволі шчыльных тканін, падшывалі іншымі тканінамі. А для таго, каб адзенне ўпрыгожыць, і для таго, каб яно трымала форму па берагах, адзенне брамавалі тканінай іншага колеру: *При подолку тоежъ ризы вооколъ якобы яблока репицъ зделаешъ с шолку синего* (КВ 54). Па падолу адзення маглі ўшываць металічныя элементы: *Вделаешъ къ тому и два кружки златыхъ, еже пришиешъ сысподу зовнутръ* (звонку) *на полици* (КВ 53б); *Звоночек пришилъ межи репицами при подолку ризы вооколъ, звоночекъ златыи и репицу округлую* (КВ 74); *ризы… зделаешъ съ шолку синего…промешивая посреди ихъ звоночки* (КВ 54).

Такім чынам, пачынаючы з эпохі Готыкі, а тым больш у часы Рэнесансу, у Вялікага Княства Літоўскага былі наладжаны развітыя эканамічныя, матрыманіяльныя і культурныя сувязі з краінамі Еўропы. У эпоху Рэнесансу жыхары Княства пашыралі міжнародныя кантакты, шляхціцы і заможныя гараджане паехалі вучыцца ў еўрапейскія ўніверсітэты – Францыск Скарына вучыўся ў Кракаўскім універсітэце, Падуанскім універсітэце, у 1512 г. абараніў доктарскую

ў Падуі – адпаведна, ўспрымалі набыткі іншых культур і станавіліся іх носбітамі. Ішоў сталы гандаль ВКЛ з заходнімі і скандынаўскімі краінамі, гандлёвыя шляхі былі адкрытыя, было створана адпаведнае заканадаўства – Статут Вялікага Княства Літоўскага. У Княства ехалі купцы, траплялі іхнія тавары, узоры адзення. Зразумела, што для жыхароў Вялікага Княства ідэі Рэнесансу, мода станавіліся роднымі. Барвенава Ганна стварыла рэканструкцыі жаночага і мужчынскага строяў заможных гараджан ВКЛ пачатку XVI ст. на аснове твораў Францыска Скарыны. Рэканструкцыі экспануюцца ў пастаяннай экспазіцыі Музея гісторыі Магілёва ў Ратушы горада Магілёва.





Барвенава Ганна. Жаночы і мужчынскі касцюм Жыхароў Вялікага княства Літоўскага XVI ст. Рэканструкцыя. Музей гісторыі Магілёва.

14 Забелин, И. Е. *Домашний быт русских цариц в XVI и XVII веках*. Москва 1901, с. 176; Костомаров, Н. И. *Очерк домашней жизни и нравов великорусского народа в XVI и XVII столетиях*. Спб,1860.

І тут варта сказаць, што касцюмы на тэрыторыі ВКЛ і ў Масковіі вельмі адрозніваліся, бо пачынаючы якраз з XV–XVI стст. геапалітычна, культурна мы разышліся ў розныя бакі. Вялікае Княства Літоўскае ў эпоху Готыкі падкрэсліла еўрапейскі кірунак развіцця і, адпаведна, моды. У XIV–XV стст. у ВКЛ панавалі гатычныя строі, а ў XVI ст. стварылі ўласны варыянт рэнесансных строяў згодна новым еўрапейскім ідэям эпохі Рэнесанс і ўспрынятай модзе. Масковія абрала іншы кірунак развіцця. У іх былі зусім іншыя адносіны да жанчын, іншы ідэал жаночай і мужчынскай прыгажосці, апісаны ў дакуменце «Домострой». У М. Кастамарава, І. Забеліна і іншых рускіх даследчыкаў напісана, што *«І сапраўды, наш дапятроўскі касцюм агульным сваім характарам набліжае нас больш да Азіі, чым да Еўропы»*[14] і ніяк не падобны да заходняга.

За два стагоддзі – XV і XVI – беларусы стварылі свае ўласныя ўзоры гатычнага, а пасля і рэнесанснага строю. Адзінства культурнай еўрапейскай прасторы спрыяла адзінству моды ў эпоху Сярэднявечча і Готыкі, падабенству строяў эліт. У эпоху Рэнесансу касцюмы жыхароў еўрапейскіх краін былі вельмі блізкія, вельмі падобныя, пры гэтым у кожнай краіне з'явіліся свае ўнікальныя ўзоры касцюмаў. І беларусы ў тым ліку стварылі свой, непаўторны касцюм эпохі Рэнесансу. Творы Францыска Скарыны, мова яго прамоў і перакладаў, гравюры дазваляюць убачыць хараство мужчынскага і жаночага строяў жыхароў Вялікага Княства Літоўскага.

**Крыніцы і іх скарачэнні:**

Ап – Скарына. *Апостал* (Skaryna. *Apostoł*)
ДЗ – Скарына. *Другі закон* (Skaryna. *Księga Powtórzonego Prawa*)
ДП – Кніга *Данііла Прарока* (*Księga Daniela*)
ДЦ – Другая кніга *Царстваў* (*Druga Księga Królewska*)
ІН – Кніга *Ісуса Навіна* (*Księga Jozuego*)
ІС – Кніга *Ісуса, сына Сірахава* (*Mądrość Syracha*)
КБ – Кніга *Быцця* (*Księga Rodzaju*)

КВ – Кніга *Выхад* (*Księga Wyjścia*)
КЕ – Кніга *Еклесіяст* (*Księga Eklezjastesa*)
КІ – Кніга *Іова* (*Księga Hioba*)
КЛ – Кніга *Лявіт* (*Księga Kapłańska*)
КР – Кніга *Руф* (*Księga Rut*)
КС – Кніга *Суддзяў* (*Księga Sędziów*)
КЭ – Кніга *Эсфір* (*Księga Estery*)
КЮ – Кніга *Юдзіф* (*Księga Judyty*)
ЛК – Кніга *Лічбаў* (*Księga Liczb*)
ПБ – Кніга *Прамудрасць божая* (*Księga Mądrości*)
ПЕ – *Плач Ерамеі* (*Lamentacje Jeremiasza*)
ПП – *Песня песняў* (*Pieśń nad Pieśniami*)
Пс – *Псалтыр* (*Psałterz*)
ПС – *Прытчы Саламонавы* (*Księga Przysłów*)
ПЦ – Першая кніга *Царстваў* (*Pierwsza Księga Królewska*)
ТЦ – Трэцяя кніга *Царстваў* (*Trzecia Księga Królewska*)
ЦЧ – Чацвертая кніга *Царстваў* (*Czwarta Księga Królewska*)

**Литература**

Барвенава, Г. А. *Тэкстыль Сярэднявечча на землях Беларусі*. Мінск 2008.

*Біблія: Факс. ўзнаўленне Бібліі, выд. Францыскам Скарынаю ў 1517–1519 гг.* Т. 1–3. Мінск, 1990–91.

Бохан, Ю. М. *Узбраенне войска ВКЛ другой паловы XIV – канца XVI ст.* Мінск 2002.

Валодзіна, Т. В. *Семантыка рэчаў у духоўнай спадчыне беларусаў*. Мінск 1999.

Дучыц, Л. У. Касцюм жыхароў Беларусі X–XIII стст.: паводле археалагічных звестак. Мінск 2005.

Забелин, И. Е. *Домашний быт русских цариц в XVI и XVII веках*. Москва 1901.

Костомаров, Н. И. *Очерк домашней жизни и нравов великорусского народа в XVI и XVII столетиях*. Спб 1860.

*Слоўнік мовы Скарыны.* Т. 1. А-О. Мінск 1977.

*Слоўнік мовы Скарыны.* Т. 2. П-Я. Мінск 1984.
*Францыск Скарына і яго час.* Энцыклапедычны даведнік. Менск 1988.
*Францыск Скарына. Зборнік дакументаў і матэрыялаў* / уклад. В. Дарашкевіч, Я. Неміроўскі. Менск 1988.

**Ілюстрацыі**

1. Францыск Скарына. 1517. Гравюра.
2. Гравюра "Эсфір царыца і цар Ясвер" з кнігі "Эсфір".
3. Фрагмент гравюры "Царыца Саўская з царом Саламонам" з кнігі "Екліcіаст".
4. Фрагмент гравюры "Дачка фараона знайшла Маісея ў вадзе" з кнігі "Выхад".
5. Фрагмент гравюры "Будаўніцтва храма ў Ерусаліме" з 3-й кнігі "Царствы".
6. Фрагмент гравюры "Дачка фараона знайшла Маісея ў вадзе" з кнігі "Выхад".
7. Фрагмент гравюры "Будаўніцтва храма ў Ерусаліме" з 3-й кнігі "Царствы".
8. Барвенава Ганна. Жаночы касцюм Жыхароў Вялікага княства Літоўскага XVI ст. Рэканструкцыя. Музей гісторыі Магілёва.
9. Барвенава Ганна. Мужчынскі касцюм Жыхароў Вялікага княства Літоўскага XVI ст. Рэканструкцыя. Музей гісторыі Магілёва.

**Bibliografia**

Barvenava G. A., *Tèkstylʹ Sârèdnâvečča na zemlâh Belarusì*, Mìnsk 2008.
*Bìblìâ: Faks. ŭznaŭlenne Bìblìì, vyd. Francyskam Skarynaû ŭ 1517–1519 gg.*, t. 1–3, Mìnsk 1990–1991.
Bohan Û. M., *Uzbraenne vojska VKL drugoj palovy XIV – kanca XVI st.*, Mìnsk 2002.
Dyčyc L. U., *Kascûm žyharoŭ Belarusì X–XIII stst.: pavodle arhealagìčnyh zvestak*, Mìnsk 2005.
*Francysk Skaryna i âgo čas*. Êncyklapedyčny davednìk, Mensk 1998.
*Francysk Skaryna. Zbornìk dakumentaŭ ì materyâlaŭ* / uklad. V. Daraškevič, Nemìroŭskì, Mensk 1998.
Kostomarov N. I., *Očerk domašnej žizni i nravov velikorusskogo naroda XVI i XVII sto-letiâh*, SPb. 1860.

*Sloŭnìk movy Skaryny*, t. 1: A–O, Mìnsk 1977.

*Sloŭnìk movy Skaryny*, t. 2: P–Â, Mìnsk 1984.

Valodzìna T. V., *Semantyka rèčaŭ u duhoŭnaj spadčyne belarusaŭ*, Mìnsk 1999.

Zabelin I. E., *Domašnij byt russkih caric v XVI i XVII vekah*, Moskva 1901.